# Маладая “Бацькаўшчына”

*Tempora mutantur, et nos mutamus in illis* — гэта лацінская прыказка пра тое, што часы мяняюцца і мы мяняемся ў іх, якая запамяталася мне зь ліцэю і якая сёлета сапраўды закранула мне душу.

Да рэйду “Бацькаўшчына’94” прымкнуў я ў Плёсках, куды яго ўдзельнікі прыйшлі з Суражу праз Страблю. Першым, што кінулася мне ў вочы, было тое, што ў купцы моладзі, якая расьселася на траве ля клюбу, я амаль нікога ня ведаў. І няма дзіва, бо ці ня большасьць зь іх былі ліцэісты. Заўжды бывалі на “Бацькаўшчыне” вельмі маладыя людзі, ды нават і дзеткі, але ў такой сіле яны зьявіліся ўпершыню.

Магчыма, што такі, а ня іншы склад удзельнікаў рэйду паўплываў на паводзіны ўсёй групы. Паколькі ішлі мы ўздоўж Нарвы, дзень праводзілі на рэчцы, загаралі (не было дзе схавацца ад сонца, якое сёлета прыпякала як ніколі), купаліся, будавалі замкі зь пяску і гулялі ў валейбол. Вогнішчы канчаліся каля поўначы, а ня раніцай, як калісь бывала.

Калі гаспадыня клюбу ў Рыбалах давала нам ключы, сурова папярэдзіла, каб не нарабілі мы балагану, бо нейкая папярэдняя экскурсія страшэнна набрудзіла. Якое ж было яе зьдзіўленьне, калі, заглянуўшы ў клюб а шостай гадзіне раніцы, пабачыла яна, як удзельнікі смачна сьпяць, а навокал узорны парадак. “Гляджу — сьпяць як анёлкі”, — сказала, заглянуўшы пазьней. Дажыліся — як анёлкі...

Вэтэраны “Бацькаўшчыны”, якія зьехаліся ў Рыбалы на Купальле (машынаў назьбіралася столькі, што можна было б зрабіць асобнае аўтамабільнае ралі), новымі парадкамі захапляліся быццам крыху менш. Адзін з заслужаных дзеячоў БАСу, сьцьвердзіўшы, што нават пляшкі няма з кім расьпіць, хутка сабраўся дахаты.

Ніколі не забуду трох вэтэранаў, якія ў наступную ноч, пасьля вогнішча, якое скончылася зноў каля поўначы, у ціхім адчаі рашыліся выпіць гэтую сымбалічную пляшку. Узялі вядро запойкі і пілі дзьве гадзіны, крывячыся, стогнучы і ўступаючы адзін аднаму чаргу. Увогуле гэта мужыкі, якія могуць выпіць, дык іхняе мучэньне ўспрымалася мною як праява псыхічнай, а не фізычнай няздольнасьці. *Tempora mutantur*...

Усё-такі мінулая рэйдавая эпоха мела свае прывабныя бакі. Не знайшлося сёлета завадатараў выпіць, але і некаму было завесьці дыскусію, якімі поўніліся, апрача песьняў, колішнія вогнішчы. Некаму было зачытаць даклад або хаця б расказаць пра мінулае ваколіцаў. Удзельнікі “Бацькаўшчыны’94” проста “мелі добры час”, як гавораць нашыя амэрыканскія браты. Прапала ў БАСе, як я ўжо калісь заўважыў, пачуцьцё місіі.

З другога боку, відаць, няма цяпер патрэбы ў нацыянальным прасьвятленьні г. зв. “народу”. У адной зь вёсак праходзіў я ля лавачкі, на якой сядзелі дзьве бабулі. Сказаў я: “Добры дзень”, — і пачуў яшчэ за сьпінаю, як адна бабуля спыталася ў другой, хто гэта будзе. Тая адказала: “Беларусы”. Тут я задумаўся, па чым яна аб гэтым здагадалася. Відаць, па кашульцы з “Пагоняй”.

За тры дні сустрэў я толькі аднаго чалавека, які ня быў упэўнены, ці ён беларус, ці ўкраінец, ды вельмі быў расчараваны тым, што я не хачу зь ім пра гэта талкаваць. Нават славуты ўкраінскі вятрак у Козьліках, які мы міналі па дарозе, робіць уражаньне апусьцелага. “Прыяжджалі тут такія...” — успомніў мімаходзь падчас размовы мясцовы селянін.

Хлопцаў, зь якімі мы ладзілі вогнішча ў Кленіках, дык наагул сьмешна было б усьведамляць, бо яны ня менш за ўдзельнікаў рэйду былі сьвядомыя.

Пасьля апошняга начлегу ў Збучы (я там ужо ня быў, але чуў, што вогнішча вельмі ўдалося) большасьць удзельнікаў рэйду пераехала гуртам у Белавежу, на Купальле, арганізаванае БГКТ, чым вельмі ўцешылі старэйшае пакаленьне. *Tempora mutantur*…

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 24 ліпеня. № 30. С. 8.